www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

23 лістапада 2007 года, № 18 (1969)

СВЯТКАВАННІ

ДНІ СТУДЭНТА Ў БДУ

Сёлета ў Беларускім дзяржаўным універсітэце як ніколі шырока адсвяткавалі Дзень студэнта. Студэнцкі саюз БДУ і ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю прыклалі шмат намаганняў для таго, каб студэнты alma mater пранікліся святочным настроем. Усё, што было арганізавана з гэтай нагоды, аказалася вельмі змястоўным і пакінула багата прыемных уражанняў.

"Круглы стол"

15 лістапада да нас завіталі прадстаўнікі моладзевых арганізацый з Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. Ламаносава, Гродненскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, а таксама з мінскіх ВНУ (БНТУ, БДУІР, БДЭУ). Калегі абмеркавалі за "круглым сталом" шляхі супрацоўніцтва студэнцкіх арганізацый у рэалізацыі сумесных праектаў. Госці распавялі, як у іх праводзіцца Дзень студэнта. Усіх зацікавіла традыцыя МДУ, калі рэктар Віктар Садоўнічы частуе студэнтаў медавухай. Сваімі ўспамінамі падзяліўся дэкан юрыдычнага факультэта БДУ (дзе і праходзіла сустрэча) Сяргей Балашэнка. Пасля пачаліся прэзентацыі.

Выступ каманды ФПМІ стаў адным з найбольш запамінальных

Першымі ўласны праект прадставілі члены Студэнцкага саюза БДУ, якія якраз прапанавалі праводзіць сумесныя Дні студэнта ў розных ВНУ, каб не толькі абмяркоўваць "рабочыя" пытанні і абменьвацца арганізацыйным досведам, але і мець магчымасць бліжэй пазнаёміцца з тым ці іншым універсітэтам і яго традыцыямі.

На "круглым стале" прагучала шмат цікавых ідэй. Напрыклад, студэнты БДЭУ прапанавалі наладзіць для сувязі паміж ВНУ адмысловае перыядычнае выданне, а таксама радыёстанцыю. БДУІР, у адпаведнасці са сваёй тэхнічнай спецыялізацыяй, вынес на абмеркаванне праект па стварэнні міжуніверсітэцкай інфармацыйнай прасторы ў інтэрнэце, дзе можна будзе абменьвацца метадычнымі напрацоўкамі грамадскіх арганізацый ВНУ, праводзіць чат-канферэнцыі. Госці з Масквы, згодна са сваім статусам, распрацавалі маштабны праект удзелу студэнтаў усёй СНД у абмеркаванні палітычных, эканамічных і культурных пытанняў.

Група падтрымкі мехмата старалася не дарэмна

Да таго ж было складзена некалькі важных дамоў аб супрацоўніцтве, а прадстаўнікі БДЭУ паабяцалі ў наступным годзе арганізаваць падобную канферэнцыю на базе сваёй установы.

"Капуснік"

16 лістапада ў Ліцэі БДУ ўсіх першакурснікаў і іх старэйшых таварышаў чакала арыгінальнае мерапрыемства – "Капуснік", які меў не толькі забаўляльны, але і спаборніцкі характар. Не думайце, што ўдзельнікі шынкавалі капусту – не, кожны факультэт паказваў сябе ва ўсёй красе. І гэта тычылася не толькі тых, хто выходзіў на сцэну, але і іх аднакашнікаў, што "хварэлі" ў зале. Ужо пры ўваходзе чуўся гоман, нібыта на футбольным стадыёне. А ўсе таму, што заўзятары з групы падтрымкі падрыхтаваліся не горш за ўдзельнікаў. У такой жывой абстаноўцы разгортваліся ўсе дзействы. Гэта было сапраўднае відовішча, на якім атрымоўваеш безліч пазітыўных эмоцый і запас энергіі! Тут нельга было вылучыць адзінага пераможцу, таму журы ўвяло некалькі намінацый. Дыплом за найлепшую мужчынскую ролю далі студэнту з факультэта радыёфізікі. А вось найлепшай актрысай прызналі не адну асобу, а адразу ўсю каманду філалагічнага факультэта. Прыз за найлепшую мініяцюру атрымаў эканамічны факультэт. "Яны на чатырох крэслах за пару хвілін паказалі ўсё наша жыццё", – падзяліўся адзін з членаў журы, калі ўручаў дыплом. Прыз за найлепшае музычнае афармленне дастаўся ФФСН. А вось дыплом за найлепшы жарт атрымала каманда механіка-матэматычнага факультэта. Журы адзначыла, што ў яе ўвесь гумар быў удалым і добрым. Натуральна, што гэта каманда і атрымала Кубак рэктара! Напрыканцы прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце Уладзімір Суораў запэўніў, што "Капуснік" абавязкова стане традыцыйным.

Свята скончылася грандыёзнай "Ноччу студэнтаў БДУ", якая прайшла ў адным са сталічных клубаў. Студэнты "адрываліся" на ўсе сто. Будзем з нецярпеннем чакаць наступнага года.

Люба ЛЕАНОВІЧ

ВЕДАЙ НАШЫХ!

НАПЕРАДЗЕ СТАЛІЦЫ ЎСЁЙ

Пераканаўчай перамогай Беларускага дзяржаўнага універсітэта завяршылася спартакіяда супрацоўнікаў ВНУ сталіцы.

Спаборніцтвы праходзілі 16-18 лістапада на базе спартыўна-аздараўленчага комплекса БДУ "Брыганціна" (г/п Радашковічы). Арганізатарамі турніра выступілі Беларускі прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі і Белдзяржуніверсітэт.

У агульнакамандным заліку наша зборная апярэдзіла сем астатніх каманд: БДПУ, БДЭУ, БНТУ, БДУІР, МДЛУ, БДТУ і Мінскага дзяржаўнага вышэйшага радыётэхнічнага каледжа. У выніку срэбраным прызёрам стаў БДЭУ, а бронзавую ўзнагароду атрымаў БНТУ.

Спаборніцтвы адбываліся па пяці відах спорту: валейболе, міні-футболе, настольным тэнісе, плаванні і шахматах. У найбольш відовішчнай і ўпартай барацьбе прайшлі гульні па міні-футболе, якія сёлета адбываліся на снезе. У фінале каманда БДУ сустрэлася з леташнім чэмпіёнам – БДТУ і здолела перамагчы з лікам 4:1, дзякуючы чаму і завявала першынство. Таксама не было роўных нашым прадстаўнікам ў шахматах і плаванні. У турніры тэнісістаў БДУ дасталася трэцяе месца, а ў валейболе чацвертае. Каманда нашага універсітэта складалася з 27 чалавек, 8 з якіх супрацоўнікі кафедры фізвыхавання і спорту. Дарэчы, усе ўдзельнікі адзначылі цудоўныя ўмовы, якія стварылі для іх работнікі САК "Брыганціна" нягледзячы на зімовае надвор'е.

Прадстаўнікі каманды БДУ з узнагародамі

Спартакіяда праводзілася ў трэці раз з мэтай прапаганды здаровага ладу жыцця і папулярызацыі фізічнай культуры і спорту.

Віталь КРУПІЦА

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

"НАШЫ ПЕРАВАГІ – АПЕРАТЫЎНАСЦЬ І НАДЗЕЙНАСЦЬ"

Пра дзейнасць РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" распавядае яго дырэктар Андрэй КАРПІЛОВІЧ

Стар. 2

"ІСЦІ ТОЛЬКІ НАПЕРАД!"

Гутарка з прафесарам фізічнага факультэта Анатолем КАМЯКОМ з нагоды яго 75-годдзя

Стар. 3

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

РЭКТАР БДУ Васіль Стражаў у якасці старшыні Савета па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі краін СНД браў удзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў дзяржаў Садружнасці, якое адбылося 22 лістапада ў Ашгабадзе.

ДЭЛЕГАЦЫЯ БДУ на чале з рэктарам прафесарам Васілём Стражавым 7–8 снежня прыме ўдзел у працы Нацыянальнай выставы Рэспублікі Беларусь у Венесуэле. У экспазіцыі нашай ВНУ будуць прадстаўлены каля 50-ці лепшых навукова-тэхнічных распрацовак.

КІРАЎНІКІ БДУ і Пултускай гуманітарнай акадэміі Васіль Стражаў і Адам Вальдэмар Касецкі 20 лістапада ў Мінску абмеркавалі далейшыя шляхі супрацоўніцтва абедзвюх ВНУ. Польская дэлегацыя наведала таксама юрыдычны і гістарычны факультэты БДУ.

НАШ УНІВЕРСІТЭТ 13 лістапада наведала дэлегацыя Навуковага савета Султаната Аман на чале з Генеральным сакратаром рады Хілалам Алі аль-Хінаі. Адбыліся перамовы с прарэктарам па навуковай рабоце БДУ Уладзімірам Паньковым. Акрамя таго, госці азнаёміліся з навукова-тэхнічнай прадукцыяй універсітэта.

ДЗЕНЬ Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. Куляшова пройдзе ў БДУ 27 лістапада. У праграме – сустрэчы кіраўніцтва, выкладчыкаў і студэнтаў абедзвюх ВНУ, "круглыя сталы", работа тэматычнай выставы "Месца класічнага універсітэта ў нацыянальнай сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь", спартыўныя мерапрыемствы, канцэрт творчых калектываў МДУ.

ДЭКАН фізічнага факультэта Віктар Анішчык 26 лістапада на пасяджэнні Вучонага савета БДУ зробіць справаздачу аб выкананні праграм перспектыўнага развіцця на факультэце.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Актыўная выдавецкая дзейнасць БДУ і высокая якасць прадукцыі прыцягваюць увагу не толькі наведвальнікаў спецыялізаваных выстаў, але і задавальняюць патрэбы міністэрстваў, ведамасных установ, пасольстваў і нават іншых ВНУ. Пра складанасць і асаблівасці гэтага працэсу нам распавёў дырэктар РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" Андрэй КАРПІЛОВІЧ, які ўжо амаль год кіруе прадпрыемствам.

Даеш якасць!

Разам з арыгіналам-макетам выдання, падрыхтаванага ва ўпраўленні рэдакцыйна-выдавецкай работы (УРВР), Выдавецкі цэнтр БДУ атрымоўвае спецыфікацыю заказу, чаго і прытрымліваецца. У апошні час сумесна з факультэтамі і кафедрамі універсітэта пачынаем выдаваць літаратуру самастойна – тут ужо мы вызначаем, што ды як будзе надрукавана. Выйшла дзве кнігі – "Беларускі фальклор" І. Казаковай, а таксама зборнік па матэматыцы П. Манастырнага. Мы самі запрашалі аўтараў, заключалі з імі дамовы. З-за таго, што тыражы ў нас значна вышэйшыя, адзін асобнік атрымоўваецца таннейшым. Дзякуючы гэтаму большая колькасць студэнтаў будзе забяспечана дапаможнікам. Мы імкнёмся выпускаць кнігі ў цвёрдым пераплёце з шыццём на нітку, каб падручнік служыў не адзін семестр, а гады 3–4. Афармленне адпавядае ўсім ДАСТам: шрыфт, белізна паперы і г. д. – па такіх кнігах вучыцца прыемна і няшкодна для здароўя.

Пра якасць нашай прадукцыі сведчыць хаця б тое, што мы – адзінае ў краіне выдавецтва пры навучальнай установе, якое рыхтуе падручнікі для агульнаадукацыйных школ. Гэтым займаюцца "Народная асвета", "Вышэйшая школа". Вось і мы з 2003 года па заказе Міністэрства адукацыі рыхтуем усе выданні па гісторыі. Сёлета ўпершыню зрабілі кнігу для малодшай школы – "Мая Радзіма – Беларусь", і вучні IV класаў краіны навучаюцца па нашым падручніку.

Без чэргаў

Да нас актыўна звяртаюцца аўтары іншых ВНУ. Высокакваліфікаваны штат рэдактараў, карэктараў – мы можам засяродзіцца на пэўнай кнізе, падрыхтаваць яе на працягу месяца і выдаць тыраж 1000 асобнікаў за 2 тыдні. Такім чынам, з моманту прыходу аўтара да моманту, калі ён будзе трымаць гатовую кнігу, пройдзе няшмат часу. Аднойчы Міністэрства адукацыі замовіла нам сто асобнікаў выдання на тысячу старонак, УРВР падрыхтавала арыгінал-макет, а мы ўсяго за тыдзень надалі кнізе фізічную форму. Да нас звярнуліся, бо ведаюць – так хутка ніхто не зробіць.

– У чым сакрэт такой хуткасці?

– Найперш – добрая арганізацыя работы. А яшчэ – калі прафесіяналу кідаюць выклік, ён забываецца на матэрыяльнае і на ўсё астатняе, каб давесці сабе і іншым – магу!

Маркетынгавая палітыка

РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" – камерцыйная арганізацыя, што існуе на гаспадарчым разліку, таму мы мусім дбаць пра прыбытковасць нашай дзейнасці. Праца з гатовым арыгіналам-макетам нам не выгадна: сам па сабе друк складае толькі палову кошту выдання. Больш прыбыткова самім падрыхтоўваць, выдаваць і рэалізоўваць прадукцыю.

Кнігу, якую атрымоўваем з УРВР, мы выдаём за кошт БДУ. Гэтыя замовы складаюць каля паловы аб'ёму вытворчасці. Астатнія кнігі друкуем за свае грошы, з выплатай аўтарскага ганарару. Намагаемся максімальна павялічыць долю прадукцыі, падрыхтаванай уласнымі сіламі. Для забеспячэння навучальнага працэсу мы маглі б выдаваць вучэбную літаратуру з Тэматычнага плана БДУ значнымі тыражамі і за свой кошт, што зменшыць нагрузку на бюджэт універсітэта. З гэтага тыражу Фундаментальная бібліятэка БДУ закупіла б патрэбную ёй колькасць кніг, а астатнія мы рэалізавалі б самі, праз уласную сетку.

Перш чым брацца за работу над пэўнай кнігай, мы вывучаем запатрабаванасць будучага выдання ў яго мэтавай аўдыторыі. Гэтым займаецца аддзел маркетынгу і збыту. Так, зараз да нас звярнуліся з медыцынскага універсітэта з патрэбай у вучэбным дапаможніку па стаматалогіі – і мы даследуем, колькі студэнтаў навучаецца на адпаведнай спецыяльнасці і колькі асобнікаў айчынныя ВНУ гатовыя заказаць для сваіх бібліятэк. Акрамя таго, для папулярызацыі нашай літаратуры мы супрацоўнічаем з шэрагам кнігагандлёвых арганізацый. Яны таксама вывучаюць перспектывы будучай кнігі – колькі асобнікаў і дзе змогуць рэалізаваць. Такім чынам фарміруецца папярэдні тыраж і вырашаецца, на якіх умовах выгадна выдаваць гэтую прадукцыю. Да прыкладу, кніга тыражом у 200 асобнікаў будзе мець вельмі значны сабекошт. Калі дадаць сюды аўтарскае ўзнагароджанне (стаўка мінімальнага ганарару – даволі істотная сума), то зразумела – такое "залатое" выданне наўрад ці будзе добра распрадавацца.

Нашы заказчыкі

У Беларусі тыражы навуковай літаратуры зрэдку перавышаюць 300 асобнікаў. Выдаткі на падрыхтоўку, выданне і рэалізацыю такой літаратуры нясуць звычайна яе аўтары – найчасцей выпуск кнігі патрэбны ім для абароны дысертацыі. Звычайна манаграфіі выходзяць тыражом 100–150 асобнікаў, што каштуе сёння, у залежнасці ад якасці тэксту і падрыхтаванасці арыгінала-макета, 600–800 тыс. руб. Выданне вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры адбываецца па іншай схеме – тут аўтар, як правіла, прадстаўляе пэўную арганізацыю. Так, у нас выдадзена два вучэбных дапаможнікі па статыстыцы Н. Дашчынскай. Гэты аўтар звярнулася да нас, і ёй спадабалася супрацоўніцтва, бо замовіла яшчэ дзве навуковыя працы. У нас размяшчаюць заказы і самі арганізацыі, якім патрэбна вучэбная ці іншая друкаваная прадукцыя. У прыватнасці, зараз рыхтуем трэці дапаможнік для Інстытута бесперапыннай адукацыі БДУ. У такім выпадку мы атрымоўваем рукапіс, які быў абмеркаваны ва ўстанове, што служыць пацвярджаннем якасці зместу. Нам застаецца толькі "адшліфаваць" кнігу і давесці да адпаведнасці ўсім ДАСТам.

Дырэктар РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" Андрэй Карпіловіч і галоўны рэдактар Таццяна Янчук абмяркоўваюць новую прадукцыю

Рэцэнзаванне і імідж

Наш профіль – вучэбная і вучэбна-метадычная літаратура. Яна абавязкова падлягае рэцэнзаванню з боку прафесараў, дактароў навук, але ўсё ж рэкамендуем атрымоўваць грыф Міністэрства адукацыі, які сведчыць аб прыдатнасці кнігі для навучальнага працэсу. Для нас гэта гарантыя адсутнасці фактычных недакладнасцяў і адпаведнасці тыпавой праграме па прадмеце. Аўтар манаграфіі таксама зацікаўлены ў сур'ёзных рэцэнзіях, што будзе істотным пры абароне дысертацыі.

Друкарскі ўчастак

– Калі да вас прыйдзе аўтар, скажам, дэтэктываў і замовіць вялікі тыраж...

– ...Мы выдадзім кнігу за ягоныя грошы. Хай шукае спонсараў. Але насамрэч не ўсё так проста. Чалавек не можа да нас прыйсці з вуліцы, ён павінен мець адпаведныя водгукі на свой тэкст, напрыклад, ад Саюза пісьменнікаў. Мы дбаем пра нашае добрае імя, таму не можам рызыкаваць – на кожнай кнізе стаіць наш лагатып, і нам не абыякава, што змешчана пад вокладкай. Часта прыносяць нешта дзіўнае, прыходзіцца ўважліва сартаваць, адкідаць "шалупінне". Да нас звяртаюцца з розных ВНУ і іншых гарадоў – гэта значыць, што за Выдавецкім цэнтрам БДУ замацаваўся імідж надзейнага партнёра для вышэйшай школы.

Распаўсюджанне

Спецыфіка літаратуры, з якой мы маем справу, патрабуе "прасоўвання", інакш кажучы, рэкламы. Даводзіцца распавядаць пра новую кнігу выкладчыка БДУ, паказваць, што яна якасная. Выданні рыхтуюцца па тыпавой праграме для ўсёй рэспублікі, таму такой кнігай могуць карыстацца і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Вырашыць праблемы з рэалізацыяй прадукцыі істотна дапамог аддзел маркетынгу і збыту. Мы рассылаем па бібліятэках свае прайслісты (абнаўляюцца раз у тры месяцы), а таксама рэкламу на кожную новую кнігу. Нам садзейнічае Фундаментальная бібліятэка БДУ, якая па дамоўленасці рассылае адпаведныя звесткі па сайтах ВНУ. Нашу рэкламу размяшчае часопіс "Вышэйшая школа". У галоўным корпусе і на юрыдычным факультэце пастаянна дзейнічаюць павільёны "Універсітэцкая кніга", але пакуль мы запаўняем іх, зыходзячы з уласных уяўленняў пра тое, што можа спатрэбіцца студэнту. Маем намер звярнуцца да дэканаў факультэтаў і загадчыкаў кафедраў па дапамогу ў падборы асартыменту: на лекцыях выкладчыкі зазвычай даюць спісы літаратуры – мы, маючы іх, маглі б забяспечваць павільёны рэкамендаванымі кнігамі, каб студэнты не вялі пошукі па ўсім горадзе ці ў інтэрнэце, а знаходзілі патрэбнае на месцы. У нас ёсць партнёры ў Расіі, якія займаюцца распаўсюджваннем нашай літаратуры ў гэтай краіне; мы, у сваю чаргу, размяшчаем тут іх навінкі, таму можам завозіць у павільёны і расійскую літаратуру, якую нашы выкладчыкі палічаць прыдатнай.

– А ці ёсць выхад на іншыя рынкі?

– Пакуль няма, бо ў асноўным гандлем беларускімі кнігамі за мяжой займаюцца прыватныя асобы, і іх умовы працы не заўсёды задавальняюць нас з пункту гледжання заканадаўства. Нам патрэбны партнёр са стабільнай структурай, надзейны, дзейнасць якога адпавядае ўсім прававым нормам.

Праблемы і планы

Хачу адзначыць, што аб'ёмы работы ўзрастаюць, аўтараў прыходзіць усё больш. Калі здараецца цэйтнот і ўвесь рэдактарскі аддзел рыхтуе адну тэрміновую кнігу – усе астатнія заказы чакаюць. Калі ж такіх выданняў трэба зрабіць некалькі адначасова, гэта прымушае нашых супрацоўнікаў заставацца лішнія гадзіны пасля працоўнага дня, што адбіваецца на самаадчуванні людзей. Таму ў апошні час мы пачынаем задумвацца над пашырэннем штату супрацоўнікаў. Абсталяванне, на якім мы працуем, досыць старое; калі фарміраваўся наш друкарска-пераплётны цэх, ніхто не думаў пра такія аб'ёмы, таму 50 % працы – ручная, неаўтаматызаваны працэс, і з гэтым анахранізмам будзем змагацца. Зараз нам трэба распрацаваць схемы набыцця якаснай лічбавай тэхнікі павышанай прадукцыйнасці. Памяшканні таксама не адпавядаюць запытам часу – у тым жа пераплётным цэху адначасова можна апрацоўваць толькі тры заказы. Астатнія проста не будзе дзе раскласці. Тысяча экзэмпляраў на асобных аркушах – гэта досыць вялікая колькасць паперы. Але, дзякуючы клопату рэктара БДУ, гэтую праблему зараз пачалі вырашаць – нам шукаюць новы будынак з большымі вытворчымі плошчамі. Мы захавалі ўсіх нашых былых заказчыкаў, у сакавіку перагледзелі цэнаўтварэнне і знізілі кошт на 17 %, у выніку выйгралі ўсе тэндэры, у якіх з таго часу бралі ўдзел. Так, напрыклад, менавіта мы падрыхтавалі для Беларускага дзяржаўнага архіву навукова-тэхнічнай дакументацыі багата ілюстраванае выданне пра вядомых дзеячаў беларускай архітэктуры "Архітэктура ў імя жыцця".

Для душы і вока

Кожная кніга – гэта дзіця, якое спачатку пестуеш, пасля выпраўляеш у свет. Але пры падрыхтоўцы выдання даводзіцца ўлічваць рэаліі жыцця, не забывацца на кошт і тэрміны. Мы можам выпусціць, напрыклад, вучэбнае выданне ў выглядзе фотаальбома на мелаванай паперы – кніга атрымаецца такой прыгожай, што будзеш рукі мыць, перш чым возьмешся за яе. Ну а што з ёй рабіць пасля? Мы не можам выдаваць літаратуру толькі дзеля свайго эстэтычнага задавальнення, мы павінны кіравацца здаровым сэнсам.

Але... ёсць у нас серыя "Scriptor universitatis" – "Універсітэцкі аўтар", у якой вы знойдзеце выданні і сучасных вучоных-гісторыкаў, і тых, хто жыў і працаваў у XIX – пачатку XX стагоддзя. Кнігу з гэтай серыі мы можам дазволіць сабе выпусціць раз на два гады, тыраж разыходзіцца толькі за пяць гадоў, бо разлічаны на сур'ёзны і не надта шматлікі кантынгент. Калі ж да нас прыходзіць заказчык, гатовы плаціць за тое, каб было прыгожа, – мы з радасцю падрыхтуем і выдадзім. Вось надоечы да нас звярнуўся дзіцячы лагер "Зубраня": ім было патрэбна штосьці яркае – буклет ці каляндар, які дзеці забралі б дахаты пасля міжнароднага форуму. Вызначальныя ў такіх выпадках не сумы заказу, а тэрмін, за які выдавецтва паспее апрацаваць ідэі заказчыка і выдаць яму гатовую каляровую прыгажосць. Яны адпусцілі нам тыдзень, а мы далі ім прадукцыю еўрапейскага стандарту.

Участак падрыхтоўкі паперы

Падрыхтавала
Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ
Фота аўтара

АСОБЫ

АНАТОЛЬ КАМЯК:

"ІСЦІ ТОЛЬКІ НАПЕРАД!"

20 лістапада споўнілася 75 гадоў прафесару кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі, доктару фізіка-матэматычных навук Анатолю КАМЯКУ.

Анатоль Камяк закончыў фізічны факультэт БДУ у 1956 г. Працаваў настаўнікам у школе, затым у Інстытуце фізікі і матэматыкі АН БССР, з 1962 г. – супрацоўнік кафедры спектральнага аналізу. З 1970 г. па 1973 г. узначальваў кафедру агульнай фізікі нефізічных факультэтаў, з 1973 г. – кафедру біяфізікі, а з 1978 г. па 1997 г. быў загадчыкам кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі. Мае больш за 250 апублікаваных навуковых работ. Сфера яго навуковых інтарэсаў – спектральныя метады даследавання структуры і ўласцівасцяў рэчыва. За падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў 1996 г. Анатоль Камяк быў ганараваны званнем заслужанага дзеяча навукі Беларусі.

– Вы пачыналі працаваць на кафедры ў той час, калі універсітэт узначальваў Антон Сеўчанка – выбітная фігура ў гісторыі БДУ. Што было характэрна для той эпохі?

– Антон Нікіфаравіч быў вучнем Вавілава, раней працаваў у Дзяржаўным аптычным інстытуце ў Ленінградзе, дзе стаў вядомым як навуковец. Да Сеўчанкі фізічнай навукай у рэспубліцы займаліся толькі некалькі супрацоўнікаў фізіка-тэхнічнага інстытута Акадэміі навук. Калі я ў 1951 г. паступіў ва універсітэт, нам не было каму выкладаць фізіку – спецыялісты адсутнічалі.І толькі з прыездам Антона Нікіфаравіча сталі чытаць паўнавартасныя лекцыі па спецыяльных курсах фізікі. Ён жа стаў маім навуковым кіраўніком у аспірантуры. У той час, дарэчы, аспіранты былі не такімі "вольнымі", як зараз, – прыходзілася вучыцца і працаваць адначасова. Я праводзіў лекцыі, здзяйсняў навуковыя даследаванні. Пасля абароны кандыдацкай у 1967 г. адразу пачаў працаваць над доктарскай дысертацыяй.

– Тэмай Вашых навуковых пошукаў стала спектраскапія комплексных злучэнняў уранілу...

– 50-я гады – гэта час, калі імкліва развівалася атамная прамысловасць. Асноўнай жа крыніцай энергіі быў уран. Мае даследаванні тычыліся вывучэння ўсіх яго спектраскапічных характарыстык. Пастаўленую задачу я адолеў. Апрача Сеўчанкі, маю работу курыраваў Леанід Валадзько, тагачасны прарэктар па навуцы. Вынікам стала наша сумесная манаграфія "Уранілавыя злучэнні". Тэма была стартэгічная. Мяне нават не выпускалі за мяжу – баяліся, што буду перадаваць сакрэты. Аднойчы я нават быў ледзве не арыштаваны, хоць пра ніякае разгалошванне і не думаў.

– Як Вы ставіцеся да будаўніцтва ў Беларусі АЭС?

– На мой погляд, зараз прынята самае важнае і правільнае рашэнне, якое саспела яшчэ 20 гадоў таму. Беларусі трэба развіваць атамную энергетыку. Альтэрнатывы ёй няма, паколькі гэта самая танная крыніца электраэнергіі. Але трэба ўзводзіць надзейную АЭС. Выбух у Чарнобылі адбыўся з-за няправільнай эксплуатацыі і памылак пры будаванні.

– Трагедыя 1986 г. неяк адбілася на Вашых даследаваннях?

– Аварыя на ЧАЭС мае тэхнагенны характар і не тычыцца фундаментальнай навукі. Акрамя таго, 6-валентны уран выкарыстоўваецца не толькі ў якасці ядзернага паліва, але прымяняецца ў хіміі, медыцыне і іншых галінах. Зрэшты, да таго часу я ўжо займаўся не толькі згаданымі даследаваннямі. Асноўныя прынцыпы мы заклалі, а далей справа за вучнямі. Зараз я больш вывучаю комплексныя крышталёвыя злучэнні кшталту кластараў. Гэта нанатэхналогія – фізіка малых памераў. Узяць, напрыклад, сукупнасць малекул, утварыць нанакластар і прымусіць яго працаваць у той жа вылічальнай тэхніцы. Наша задача – пабудаваць звышскладаную машыну пры выкарыстанні аптычных метадаў апрацоўкі інфармацыі.

– Нягледзячы на складанасці, Вы не баяліся працаваць з замежнымі студэнтамі, у адрозненне ад большасці выкладчыкаў. Адкуль такая зацікаўленасць?

– Сапраўды, пачынаючы з 1980-х гадоў, мне як загадчыку кафедры часта даводзілася працаваць са студэнтамі-замежнікамі. У асноўным яны прыязджалі да нас вучыцца з В'етнама, Кітая, Ірана, Іарданіі, Венесуэлы, Балівіі... Канешне, акрамя моўных цяжкасцяў, даводзілася "падцягваць" іх базавую адукацыю – чытаць дадатковыя лекцыі па агульных раздзелах фізікі. Адначасова гэтая моладзь прывабліла сваёй працаздольнасцю, імкненнем атрымаць сучасныя веды. Мы ж, са свайго боку, адчувалі адказнасць за якасную падрыхтоўку спецыялістаў для сяброўскіх краін. Дарэчы, чацвёра маіх "замежнікаў" абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Беларускія ж студэнты заўсёды адрозніваліся фундаментальнай адукацыяй і шырокім профілем падрыхтоўкі. Многія з нашых выпускнікоў паспяхова працуюць за мяжой, знаходзячы прымяненне сваім ведам у розных галінах. Але варта адзначыць, што і зараз у нас вельмі здольныя студэнты. Мы рыхтуем спецыялістаў для прамысловасці. Яны запатрабаваныя ва ўсіх галінах, паколькі сёння не магчыма вытворчасць тэхнічных вырабаў без вывучэння працэсаў, якія адбываюцца ўнутры рэчыва.

– Якім чынам адпачываеце ад працы?

– Маё хобі – гэта будаўніцтва. Усё жыццё, займаючыся фізікай, я пакрысе асвойваў будаўнічыя спецыяльнасці: майструю падлогу, магу ўставіць вокны, пакласці кафлю, паставіць сцены. Навуковы супрацоўнік, які шмат працуе ў лабараторыі, павінен займацца фізічнай працай, развіваць мышцы. Кожную раніцу я раблю гімнастыку для падтрымання сябе ў тонусе. З дзяцінства знаёмы з сельскай гаспадаркай, таму люблю пакапацца ў зямлі на дачы, дзе практычна ўсё зроблена сваімі рукамі.

– Ці ёсць дэвіз, з якім ідзеце па жыцці?

– Мой дэвіз – ісці толькі наперад і ў нагу з часам. Трэба ставіць перад сабой мэты і дасягаць іх. Галоўнае – не стаяць на месцы.

Яўген ПЕШЧУР
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

У ПРАФКАМЕ

"БУДЗЬ РАЗАМ З НАМІ"

Пад такой назвай на базе САК "Алімпіец" прайшоў семінар-злёт для старшыняў прафбюро пярвічных прафсаюзных арганізацый ВНУ рэспублікі, які зладзіў Беларускі прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі (БПСРАіН).

Старшыні прафбюро Белдзяржуніверсітэта агульнымі намаганнямі запаўняюць анкету ўдзельніка злёту і рашаюць тэст "Студэнцкае права", прапанаваны арганізатарамі.

Па словах старшыні БПСРАіН Аляксандра Бойкі, сёння нашай дзяржаве патрэбны перадавыя кіраўнікі, аналітыкі, стратэгі, і прафсаюз мусіць быць кузняй гэткіх кадраў.

– На такіх семінарах ёсць магчымасць атрымаць важную інфармацыю. Бо толькі дасведчаны лідар можа павесці за сабой астатніх, – запэўніў намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Андрэй Лук'яновіч.

Удзельнікі згаданага мерапрыемства сапраўды ўзялі для сябе шмат карыснага. Падчас сустрэчы была акрэслена роля прафсаюза ў рэалізацыі моладзевай палітыкі, закрануты пытанні нарматыўна-прававога поля, сацыяльнай абароны студэнтаў і інш.

– За вырашэннем сацыяльных праблем студэнтаў мы адышлі ад навучальных аспектаў, – заўважыў намеснік старшыні БПСРАіН Раман Дапіра. – У кожным прафбюро маецца вучэбная камісія, якая павінна адсочваць расклад заняткаў, пераход з платнай на бюджэтную форму навучання, стыпендыяльнае забеспячэнне студэнтаў. Мы праводзім зараз праверкі ва універсітэтах і выкрываем досыць парушэнняў... Хто ж абароніць правы студэнта, як не прафбюро факультэта?

Галоўны спецыяліст аддзела вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Алена Ліпа запрасіла маладых лідараў прыняць удзел у распрацоўцы падзаконных нарматыўных актаў да прынятага Закона "Аб вышэйшай адукацыі":

– Вы – практыкі, таму нам, законастваральнікам, вельмі важна ваша меркаванне. Тут сабралася 120 кампетэнтных чалавек, якія могуць сфармуляваць прапанову, прыдатную да заканадаўчага ўвасаблення.

Паводле Алены Ліпы, спрэчных пытанняў насамрэч шмат: ці дазваляць аднаўляцца студэнту на першы курс, на працягу якога тэрміну даваць такое права (напрыклад, у Міністэрства звярнуўся 60-гадовы мужчына, які праз 40 гадоў раптам вырашыў аднавіцца на чацвёрты курс ВНУ) і інш. Распрацоўваюцца дакументы, якія тычацца акадэмічнага адпачынку. Зараз яго можна атрымаць толькі на падставе медыцынскай даведкі. Заканадаўцы ж хочуць пайсці студэнтам насустрач і даць магчымасць як "платнікам", так і "бюджэтнікам" узяць адзін раз аднагадовую акадэмічную паўзу за перыяд навучання з-за фінансавых або іншых прычын.

Пасля тэарэтычнай часткі семінара моладзь падзялілася на групы: адны з дапамогай трэнінгу выяўлялі свае лідарскія якасці, другія атрымлівалі кансультацыі па розных пытаннях (правы і абавязкі студэнтаў, бяспека вучэбна-выхаваўчага працэсу, прававы аспект часовага працаўладкавання студэнта, часовая занятасць за мяжой), трэція ж удзельнічалі ў дзелавой гульні "Дзяржава".

"На дысерт" прафсаюзных актывістаў чакала культурная праграма ад арт-групы Федэрацыі прафсаюзаў "Беларусы", калектыву "byCity" і каманды КВЗ "Налева".

Надзея ДРЫЛА
Фота аўтара

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі, тэхналогіі праграмавання;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнай і інстытуцыяльнай эканомікі, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, фізічнай оптыкі, матэматычнага забеспячэння АСК, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, фізічнага выхавання і спорту, фізічнай оптыкі, англійскага мовазнаўства, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: замежнай літаратуры, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычнага забеспячэння АСК, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, матэматычнай фізікі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў; тэл. 209-54-36.

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

СПАСЦІГАЮЧЫ КУПАЛУ І КОЛАСА

1–3 лістапада на філалагічным факультэце БДУ адбылася VIII Міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай", прысвечаная 125-годдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Зараз вяртанне гістарычнай духоўнай спадчыны Беларусі набывае агульнанацыянальнае значэнне. Адкрываючы канферэнцыю, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры прафесар Тацяна Шамякіна падкрэсліла, што творчасць славутых класікаў беларускай літаратуры заўсёды арыентавалася на духоўныя асновы нацыянальна-сутнаснага існавання беларускага народа і сёння з'яўляецца традыцыйнай апорай сучаснай літаратуры і культуры.

З прывітальным словам да гасцей і ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуліся прарэктар БДУ прафесар Уладзімір Клюня, дэкан філалагічнага факультэта прафесар Іван Роўда, загадчык кафедры славянскіх літаратур філалагічнага факультэта прафесар Іван Чарота і інш.

У сваіх выступленнях вядучыя навукоўцы звярнуліся да пытанняў фенаменальнасці беларускай літаратуры, якая за адносна кароткі тэрмін стала ўровень з перадавымі літаратурамі свету, спынілася на праблемах узаемадачыненняў старабеларускай літаратуры са славянскім светам, прааналізавалі на аснове новых падыходаў у літаратуразнаўстве зборнік вершаў Купалы "Спадчына" як мастацкае цэлае.

Удзельнікі канферэнцыі наведалі кабінет-музей беларускай культуры, музей філалагічнага факультэта, усклалі кветкі да помнікаў Янку Купалу і Якубу Коласу, прагледзелі дакументальную стужку "Спадчына", прысвечаную 125-годдзю з дня нараджэння народных пісьменнікаў.

Валянціна КЛЯНІЦКАЯ

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Да 60-годдзя народнага ансамбля танца "Крыжачок" – "Культура" (10.11).

Інтэрв'ю з дырэктарам НДІ ядзерных праблем БДУ Уладзімірам Барышэўскім – "Беларусь сегодня" ("СБ", 10.11).

Аб адкрыцці ў БДУ з новага навучальнага года Інстытута журналістыкі – БелТА (30.10); tut.by (31.10); open.by (30. 10); БелаПАН (12.11); naviny.by (13.11); np.by (12.11).

Пра светлафоры новага пакалення, распрацаваныя ў "Канструктарскім бюро спецыяльнай тэхнікі" БДУ – "Рэспубліка" (14.11).

"Круглы стол" у "СБ" пра рэформу школы з удзелам рэктара БДУ прафесара Васіля Стражава – "Беларусь сегодня" (15.11).

Пра свой удзел у міжнародных алімпіядах распавядае студэнт II курса хімічнага факультэта БДУ Дзмітрый Фірага – "Репетитор" (№ 10)

Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ

23 лістапада 2007 года, № 18 (1969)

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

Английский язык: контрольные работы для слушателей подготовительного отделения и подготовительных курсов. Дапаможнік змяшчае дзевяць кантрольных работ паводле асноўных граматычных тэм праграмы па англійскай мове ў сярэдняй школе. Кантрольныя работы апрабаваны на падрыхтоўчым аддзяленні для беларускіх грамадзян факультэта дауніверсітэцкай адукацыі.

Анохина В.В. **Пропедевтика. Исторические типы классической философии.**

Вучэбна-метадычны комплекс змяшчае лекцыйны курс, арыентаваны на засваенне прадмета і спецыфікі гістарычных тыпаў класічнай філасофіі ў рамках праграмы базавага курса "Філасофія", які прызначаны для падрыхтоўкі бакалаўраў па спецыяльнасці "Філасофія". У ім прадстаўлены розныя варыянты практыкумаў, семінарскіх заняткаў, калёквіумаў, заданняў для самастойнай работы, тэстаў, якія дазваляюць актывізаваць творчае мысленне студэнтаў і кантраляваць ступень засваення імі навуковага матэрыялу, а таксама тэматыка рэфератаў і шырокі спіс арыгінальных крыніц, асноўнай і дадатковай літаратуры па раздзелах курса.

Беларуская літаратура: контрольныя работы і метадычныя рэкамендацыі для слухачоў падрыхтоўчых аддзяленняў і падрыхтоўчых курсаў. Кантрольныя работы, якія ўключаны ў вучэбна-метадычны дапаможнік, апрабаваны на кафедры дауніверсітэцкай падрыхтоўкі і прафарыентацыі моладзі факультэта дауніверсітэцкай адукацыі БДУ.

Беларуская мова: контрольныя работы і метадычныя рэкамендацыі для слухачоў падрыхтоўчых аддзяленняў і падрыхтоўчых курсаў. Вучэбна-метадычны дапаможнік па беларускай мове складаецца з кантрольных работ, апрабаваных на кафедры дауніверсітэцкай падрыхтоўкі і прафарыентацыі моладзі факультэта дауніверсітэцкай адукацыі БДУ.

Биология: контрольные работы для слушателей подготовительного отделения и подготовительных курсов. Дапаможнік змяшчае дзевяць кантрольных работ па біялогіі і метадычныя рэкамендацыі да іх.

Бурко Л.Д. **Зоология позвоночных.** Разглядаюцца марфалагічныя асаблівасці прадстаўнікоў розных груп хордавых жывёл, іх знешняя і ўнутраная будова.

Василевич Г.А. **Права человека.** Разглядаюцца асноўныя аспекты правоў і свабод чалавека і грамадзяніна ў кантэксце прынцыпаў і нормаў міжнароднага права, Канстытуцыі РБ.

Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы

КОНКУРСЫ

ДЗЕЦІ НАШЫМІ ВАЧЫМА

"Дзеці і дзіцячае" – так называўся конкурс фотаработ сярод студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і супрацоўнікаў універсітэта, арганізаваны Студэнцкім саюзам БДУ пры падтрымцы ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю.

Прыгажосць – гэта тое, што прыемна і падабаецца чалавеку, робіць яго шчаслівым. Што можа быць больш кранальным за дзіця, яго непасрэднасць, прывабнасць і чысціню? 300 работ, пададзеных на конкурс, выпраменьвалі цеплыню, дарылі радасць і добры настрой усім наведвальнікам імпрэзы, у тым ліку і журы. Паколькі вызначыць пераможцу пры такой масавасці – задача вельмі цяжкая, то лаўрэаты размеркаваліся па некалькіх намінацыях.

Найлепшай "Ідэяй" прызнана серыя работ "Свет вачыма Палінкі" Дарыі Кірушчэнкавай (ДзІКСТ), дзе аўтар скіравала ўвагу да ўнутранага адчування малечы, у якой ёсць свае праблемы і перажыванні, думкі і мэты ў жыцці. І да іх нельга адносіцца легкадумна – дзіцячы свет не менш складаны, чым дарослы. У намінацыі "Імгненне" журы адзначыла ўдалы фотакадр "Хлопчык з сабакам" студэнткі гуманітарнага факультэта Веры Токаравай. Перамогу ў "Кампазіцыі", у якой экспертная камісія звяртала ўвагу на агульную ідэю, выяўленую ў фатаздымках, граматную пабудову і гарманічнае размяшчэнне ўсіх кадраў, прысудзілі Святлане Даўганюк. У намінацыі "Арыгінальнасць" была вылучана студэнтка эканамічнага факультэта Дар'я Федзькіна. Цікава падабраныя фотасюжэты і цудоўнае выкананне стварылі атмасферу дзіцячай непасрэднасці ў спазнанні навакольнага свету.

Узнагароджанне пераможцаў конкурсу прайшло 16 лістапада ў Ліцэі БДУ на універсітэцкім "Капусніку", і ў той жа дзень адбылася выстава фотаработ.

Святлана Даўганюк, метадыст УВРМ

СТУДЭНЦКІ ДРУК

Падведзены вынікі конкурсу "Найлепшая малатыражная студэнцкая газета", гэтым разам прысвечанага Году дзіцяці.

12 работ ацэньвала камісія ў складзе прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзіміра Суворава, начальніка прэс-службы БДУ Вольгі Шчадрыной, прадстаўнікоў факультэта журналістыкі і грамадскіх моладзевых арганізацый універсітэта. Пры гэтым улічваліся якасць выканання конкурснага задання (інфарматыўнасць, выкарыстанне цікавага фактычнага матэрыялу і шырыні праблематыкі, змястоўнасць і лаканічнасць у раскрыцці тэмы) і дызайн выдання, які ўключае ў сябе навізну рашэння, ілюстрацыйнасць, стылістычнае адзінства.

У выніку пераможцы размеркаваліся наступным чынам: I месца – "Вестник мехмата"; II месца раздзялілі "Коллега" (Юрыдычны каледж) і "Вострaў Юфъ" (юрыдычны факультэт).

Спецыяльны прыз за арыгінальнасць ідэі прысудзілі газеце факультэта журналістыкі "Перья".

Паводле інфармацыі ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю

ДОБРАЯ СПРАВА

ЛЮБОЎ БЕЗ МЕЖАЎ

Акцыя "Годнае дзяцінства" займела свой працяг. Члены Каардынацыйнага савета і студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ, а таксама звычайныя студэнты зноў наведалі дзіцячы дом у Слуцку. Невядома, хто быў больш узрадаваны: ці то дзеці, ці то студэнты, якія ўбачылі знаёмыя твары хлопчыкаў і дзяўчынак, падросłых за год. Бавіць час разам было цікава і адным, і другім.

Старэйшыя імкнуліся як мага болей распавесці сваім малодшым таварышам пра свет, дзе ім прыйдзецца жыць і прымаць самастойныя рашэнні. Для эфектыўнасці дзяцей падзялілі на тры ўзроставыя групы. Кожнай з іх была прапанавана асаблівая праграма.

Да самых маленькіх на чароўным караблі прыплылі піраты і добрыя феі, каб разам накіравацца ў Афрыку за скарбамі. Малышы ўдзельнічалі з задавальненнем і атрымалі за гэта вялізны куфар з садавінай і ласункамі.

Вучні VI–VIII класаў таксама падарожнічалі. Са студэнтамі яны наведалі розныя планеты Сонечнай сістэмы. Самыя дарослыя разважалі пра адвечныя каштоўнасці, абмяркоўвалі далейшыя планы са старшынёй Каардынацыйнага савета Уладзімірам Бандарэнкам.

Як вядома, да гасцей з пустымі рукамі не ходзяць. Не парушаючы традыцый, прадстаўнікі БДУ падрыхтавалі падарункі для выхаванцаў дзіцячага дома: DVD-прайгравальнік, спартыўны інвентар, мяккія цацкі і, канешне ж, канцэртную праграму з яркімі нумарамі.

Паездка атрымалася цудоўнай. Доказам гэтаму сталі радасныя ўсмешкі на тварах дзяцей, бляск у ваччу і жаданне добра вучыцца, каб здолець паступіць у "найлепшы ў свеце" універсітэт. Але галоўнае – падлеткі, якія апынуліся без бацькоўскай апекі, адчулі сябе незабытымі, патрэбнымі і адоранымі клопатам і любоўю.

Юлія ХМЯЛЕЎСКАЯ

АНОНС

Каменная казка

З 5 па 9 снежня ў галоўным корпусе БДУ (4-ы паверх) будзе праходзіць чарговая мінералагічная выстава-кірмаш "Каменная казка". На гэты раз яна прысвечаная Міжнароднаму году палярных даследаванняў. У яе рамках 6 снежня ў 15.00 адбудзецца сустрэча з удзельнікамі палярных экспедыцый. Пасля будзе прадэманстраваны фільм аб Антарктыдзе.

Упершыню наведвальнікі змогуць пабачыць калекцыю сінтэтычных алмазаў прадпрыемства "Адамас БДУ".

З УСМЕШКАЙ

Размаўляюць студэнты:

– Ты ўжо колькі іспытаў заваліў?

– Разам з заўтрашнім – пяць.

***

Выкладчык падчас іспыту заўважыў, як студэнт употай імкнецца выцягнуць шпаргалку. Пачаў назіраць за ім. Уцягнуўся. Абодва нервуюцца, пацеюць. Нарэшце выкладчык не вытрываў:

– Ну цягні ж ты, цягні смялей...

***

Іспыт. Прафесар задае студэнту пытанне за пытаннем. Той маўчыць.

– Ну добра, апошняе пытанне. Хто адкрыў Амерыку?

Студэнт паціскае плячыма.

– Калумб! – крычыць выкладчык. – Калумб!

Студэнт падымаецца і выходзіць з кабінета. Выкладчык:

– Куды гэта вы накіроўваецеся?

– А я падумаў, што Вы наступнага паклікалі.

***

Палкоўнік на лекцыі:

– Гэта – ядро, а вакол яго варочаюцца электроны (малюе)...

– Можна пытанне? А вось што паміж ядром і электронам?

– Як што – паветра!

ШАНОЎНАЕ СТУДЭНЦТВА!

- **Калі вы адчуваеце ў сябе здольнасці,**
- **Калі жадаеце паспрабаваць свае сілы ў журналістыцы –**

дайце волю творчаму імпэту і дасылайце свае матэрыялы (па тэме БДУ) ў газету "Універсітэт".

Шчыра запрашаем таленавітых аўтараў да супрацоўніцтва ў якасці пазаштатных карэспандэнтаў. Пішыце нам пра ўсе падзеі і асоб, якія маюць дачыненне да alma mater.

Нагадаем, што наша выданне мае ўласны сайт **www.gazeta.bsu.by**, дзе даецца значна пашыраная версія газеты. Тут жа вы можаце паўдзельнічаць у займальных конкурсах ці абмеркаваннях на форуме.

Дарэчы, рэдакцыя "Універсітэта" адкрытая да прапаноў па ўдасканаленні якасці выдання. Са сваімі ідэямі звяртайцеся па адрасе: вул. Бабруйская, 7, каб. 411, ці накіроўвайце лісты на e-mail: gazeta@bsu.by. Наш тэлефон 209 53 45.

Зрабіце сабе імя на старонках агульнаўніверсітэцкай газеты!

Рэдакцыя газеты "Універсітэт"

СУПРАЦОЎНІЦТВА

НАРАДА "ЭЛЕКТРОНШЧЫКАЎ"

У Белдзяржуніверсітэце на базе фізічнага факультэта 14–16 лістапада прайшло Міжнароднае пасяджэнне спецыялістаў краін СНД па функцыянальных матэрыялах электронікі.

У нарадзе бралі ўдзел вядучыя вучоныя ў галіне электронікі, фізікі, неарганічнай хіміі і матэрыялазнаўства паўправаднікоў з Беларусі, Расіі, Украіны і Казахстана, сярод якіх акадэмікі Расійскай акадэміі навук Аляксандр Арлікоўскі і Аляксандр Ялюцін, член-карэспандэнт РАН, рэктар МІЭТ Юрый Чаплыгін, члены-карэспандэнты НАН Украіны Уладзімір Літоўчанка і Вячаслаў Пузікаў. Былі абмеркаваныя пытанні стану паўправадніковых матэрыялаў у краінах СНД, атрымання і выкарыстання крэменю і іншых паўправадніковых крышталёў для мікраэлектронікі, а таксама сучаснай адукацыі ў галіне матэрыялазнаўства і электронікі. Госці наведалі Аб'яднаны інстытут фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў НАН Беларусі, вытворчае аб'яднанне "Інтэграл", кафедры і лабараторыі фізічнага факультэта БДУ.

На круглым стале ўдзельнікі пасяджэння адзначылі развіццё ўзаемаадносін паміж навуковымі арганізацыямі згаданых краін, выказаліся за неабходнасць аднаўлення вытворчасці крэменю ў СНД, пачынаючы з вытворчасці сыравіны і чыстага сілану і заканчваючы вырошчваннем монакрышталёвых зліткаў, і ўзмацнення навуковай і тэхналагічнай кааперацыі ў галіне фотавальтаікі і нанаматэрыялаў.

Прафесар Аляксандр ФЕДОТАЎ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

23 лістапада 2007 года
Падпісана да друку 21.11.2007 г.
Зак. 1182. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by